**КАМЯНЕ́ЦКАЯ ВЕ́ЖА**, помнік абарончага дойлідства ў г. Камянец. Узведзена ў 1276—88 у цэнтры драўляных фартыфікацыйных збудаванняў па загадзе валынскага кн. Уладзіміра Васількавіча дойлідам Алексам з мэтай умацавання паўн. мяжы Валынскага княства. У 14—17 ст. пашкоджана падчас шматлікіх атак крыжакоў, палякаў, крымскіх татар, вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654—67). Выкарыстоўвалася пад сховішча, свіран. У час паўстання 1863—64 К.в. служыла абарончым пунктам царскіх войск; на ёй былі ўстаноўлены гарматы. У 1899—1903 рэстаўрыравана (па праекце архіт. В.Суслава) — адноўлена цагляная муроўка (гродзенскі майстар А.Арцішэўскі), сфарміраваны кольцападобны земляны вал, створаны 3 дрэнажныя каналы для адтоку вады. У 1957 пабелена, у 1998 вернуты першапачатковы выгляд. У 1968—73 і 1996—2003 паўторна рэстаўрыравана. Уяўляе круглае ў плане 5-яруснае мураванае збудаванне выш. 29,4 м у форме ўсечанага конуса з нахілам па вертыкальнай восі. Дыяметр фундамента 16 м, вонкавы дыяметр — да 13,5 м; таўшч. сцен — да 2,5 м. Агульная пл. памяш-

*Камянецкая вежа.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каннеў 313,2 м². Перакрыта нервюрнымі скляпеннямі з кранштэйнамі, над якімі месціцца баявая галерэя з 14 прамавугольнымі зубцамі, з якіх 1 захаваны, інш. ўзноўлены. Фундамент «плаваючы» (палявыя камяні перасыпаны рачным пяском). Сцены складзены з цёмна-чырвонай і жоўтай брусчатай цэглы («пальчаткі») памерамі 26,5×13,5×8 см на вапнавай рошчыне з дабаўленнем пяску, тоўчанага мелу, бялку яек, аздоблены плоскімі арачнымі нішамі і прарэзаны байніцамі шчылепадобнага і стральчатага абрысу (на 5 ярусе). З 5-га яруса на баявую галерэю (цяпер — аглядная пляцоўка) вядуць вузкія праходы, асветленыя двума вузкімі акенцамі. З 1960 у вежы знаходзіцца філіял *«Камянецкая вежа»* Брэсцкага абл. краязнаўчага музея.

*Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ